**Каласоўскі А. А. ,** выкладчык кафедры эканамічнай геаграфіі і аховы прыроды (БДПУ)

**Сасноўскі В. М.,** кандыдат геаграфічных навук, дацэнт

# ГЕАГРАФІЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БЕЛАРУСІ Ў СУЧАСНЫХ УМОВАХ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Беларусь – краіна індустрыяльная, па асноўных параметрах эканамічнага развіцця прамысловасць займае вядучае месца. Так, у 2013 г. на яе долю прыпадала 25% усіх занятых, 27% ВУПа краіны, 36% вартасці асноўных сродкаў, 36% інвестыцый у асноўны капітал і 58% усяго экспарту. Больш таго, прамысловасць з'яўляецца асноўным відам эканамічнай дзейнасці ва ўсіх абласцях. У структуры ВРП яе доля вагаецца ад 32% у Брэсцкай да 45% у Мінскай вобласці і толькі ў Мінску яна некалькі саступае такому віду дзейнасці, як гандаль; рамонт аўтамабіляў, бытавых вырабаў і прадметаў асабістага карыстання (адпаведна 26% і 27%).

Усё гэта дае падставы для грунтоўнага геаграфічнага вывучэння прамысловасці на сённяшнім этапе развіцця краіны і, што не менш важна, у бліжэйшай перспектыве. На жаль, айчынная геаграфічная навука, а таксама іншыя спецыялісты ў галіне рэгіянальных даследаванняў амаль не закранаюць рэальных праблем геаграфіі прамысловасці як асновы кардынальнай трансфармацыі тэрытарыяльнай арганізацыі грамадства. Імкненне звесці іх да выратавальнай ролі фарміравання рэгіянальных кластэраў, холдынгаў, татальнай мадэрнізацыіі толькі адсоўвае ад вырашэння найважнейшых пытанняў яго прасторавага жыцця. Важна зразумець, што ад характару размяшчэння прамысловасці залежыць не толькі ўзровень эканамічнага развіцця тых ці іншых рэгёнаў, але і весь комплекс вытворчасцей, неабходных як самой прамысловасці, так і насельніцтву гэтых рэгёнаў. Граматнае, рацыянальнае размяшчэнне прамысловых аб'ектаў можа забяспечыць не

меншы рост прадукцыйнасці працы, чым выкарыстанне новай тэхнікі. Іншымі словамі кажучы, задача эфектыўнага развіцця эканомікі не можа быць вырашана без уліку яе прасторавай арганізацыі. Жыццё паказвае, што некаторыя аб’екты прамысловасці, на якіх адбылася мадэрнізацыя (напрыклад, цэментныя заводы, прадпрыемствы дрэваапрацоўкі), сутыкнуліся з праблемай рэалізацыі прадукцыі. І калі той самы цэмент лёгка накіраваць на будаўніцтва дарог, з прадукцыяй дрэваапрацоўкі сітуацыя выглядае больш складана. Такая недальнабачнасць у размяшчэнні і мадэрнізацыі прадпрыемстваў розных відаў эканамічнай дзейнасці, адарванасць ад рэсурсаў і рынкаў збыту, ігнараванне існуючай сістэмы рассялення выліваецца ў вельмі вялікія страты.

Найважнейшая геаграфічная асаблівасць развіцця прамысловасці краіны апошніх дзесяцігоддзяў – *вялікая дыспрапарцыянальнасць.* Пры гэтым яна характэрна не толькі для паказчыкаў удзельнай вагі абласцей у агульным аб’ёме вытворчасці прамысловай прадукцыі Беларусі, але і для паказчыка вытворчасці гэтай прадукцыі на душу насельніцтва (табл.1). У першым і другім выпадках розніца паміж максімальным і мінімальным значэннямі перавышае 2 разы, што для такога ўзроўню рэгіёнаў з’яўляецца даволі значнай велічынёй.

Табліца 1 – Дынаміка тэрытарыяльнай структуры вытворчасці прамысловай прадукцыі Беларусі за 1990-2013 гг., %

| Вобласці | 1990 г. | 2000 г. | 2010 г. | 2013 г. | Аб’ём прамысловай вытворчасці на душу насельніцтва, 2013 г., млн. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| Рэспубліка Беларусь | 100 | 100 | 100 | 100 | 63,9 |
| Брэсцкая | 11,3 | 9,0 | 9,5 | 9,9 | 43,3 |
| Віцебская | 15,3 | 19,4 | 17,4 | 15,8 | 79,5 |
| Гомельская | 16,8 | 19,5 | 21,1 | 20,7 | 88,1 |
| Гродзенская | 10,3 | 9,6 | 9,6 | 10,3 | 59,1 |
| г.Мінск | 22,1 | 19,3 | 18,4 | 17,5 | 55,3 |
| Мінская | 11,8 | 13,1 | 14,7 | 15,7 | 67,9 |
| Магілёўская | 12,4 | 10,1 | 9,3 | 10,0 | 56,5 |

Цікава заўважыць, што адрозненні паміж рэгіёнамі ў колькасці арганізацый прамысловасці выглядаюць яшчэ большымі і перавышаюць 3 разы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– паміж г.Мінскам, дзе іх найбольшая колькасць (3873) і Віцебскай вобласцю, дзе іх менш за ўсё (1206). З гэтай акалічнасцю звязана яшчэ адна геаграфічная асаблівасць развіцця прамысловасці Беларусі – *высокая канцэнтрацыя вытворчасці.* Дастаткова адзначыць, што на тры прамысловыя арганізацыі ва ўсёй апрацоўчай прамысловасці краіны прыпадае пятая частка ўсёй выпрацоўчай прадукцыі (Нафтан, Беларуськалій і Мазырскі НПЗ), у вытворчасці і размеркаванні электраэнергіі, газа і вады тры арганізацыі выпрацоўваюць ужо 53% прадукцыі (Віцебскэнерга, Мінскэнерга і Гомельэнерга), а ў горназдабыўной прамысловасці – аж 87% (Беларусьнафта, Граніт і Мазырсоль). Праведзенае намі ранжыраванне рэгіёнаў па важнейшых параметрах прамысловага развіцця таксама пацвярджае гэту асаблівасць, але ўжо не па відах эканамічнай дзейнасці, а па тэрыторыі (табл.2).

Табліца 2 – Ранжыраванне рэгіёнаў Беларусі па важнейшых параметрах прамысловага развіцця, 2013 г.*

| Колькасць арганізацый прамысловасці, адзінак | Аб'ём прамысловай вытворчасці,% | Аб'ём прамысловай вытворчасці на адну арганізацыю прамысловасці, млрд руб. | Аб'ём прамысловай вытворчасці на душу насельніцтва, млн. руб. |
|---|---|---|---|
| гМінск | Гомельская | Гомельская | Гомельская |
| Мінская | г.Мінск | Віцебская | Віцебская |
| Брэсцкая | Віцебская | Гродзенская | Мінская |
| Гомельская | Мінская | Магілёўская | Гродзенская |
| Магілёўская | Гродзенская | Брэсцкая | Магілёўская |
| Гродзенская | Магілёўская | Мінская | г.Мінск |
| Віцебская | Брэсцкая | г.Мінск | Брэсцкая |

*Рэгіёны прыведзены ў паслядоўнасці ад самага высокага паказчыка да самага нізкага.

Даныя табл.2 дазваляюць таксама прасачыць пэўную сувязь паміж дыспрапарцыянальнасцю і канцэнтрацыяй прамысловай вытворчасці: чым большая колькасць прамысловых арганізацый у рэгіёне, тым, як правіла,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

меншыя аб’ёмы вырабляемай прадукцыі прыпадаюць на адну арганізацыю і на душу насельніцтва.

Яшчэ больш яскрава вышэйнагаданыя асаблівасці праяўляюцца на ўзроўні адміністрацыйных раёнаў і асобных прамысловых цэнтраў. Разлічаны намі аб’ём прамысловай вытворчасці на душу насельніцтва ў сярэднім за 2011-2013гг. сведчыць аб тым, што розніца паміж раёнамі (Мазырскім і Краснапольскім) перавышае 100 разоў (мал.1). Нават у межах абласцей гэты паказчык вагаецца ад 86 раз у Гомельскай (паміж Мазырскім і Брагінскім раёнамі) да 19 разоў у Магілёўскай вобласці (паміж Асіповіцкім і Краснапольскім раёнамі).

Аб высокай ступені канцэнтрацыі вытворчасці можна меркаваць на падставе таго, што на долю сталіцы і абласных цэнтраў у 2013 г. прыпадала 36% усёй прамысловай прадукцыі краіны, а калі дадаць сюды яшчэ рэгіянальныя цэнтры (Бабруйск, Баранавічы, Барысаў, Ліду, Мазыр, Маладзечна, Наваполацк, Оршу, Пінск, Полацк, Салігорск) гэты паказчык павялічваўся да 63%.

Такой жа высокай тэрытарыяльная канцэнтрацыя прамысловасці з’яўляецца і на абласным узроўні. Так, у кожнай з абласцей, за выключэннем Віцебскай і Гомельскай, абласныя цэнтры застаюцца лідарамі індустрыяльнага развіцця. Пры гэтым на іх долю прыпадае каля 40% аб’ёма прымысловай вытворчасці сваіх абласцей. Зразумела, што роля іншых гарадскіх пасяленняў, ды і раёнаў у цэлым застаецца неістотнай (мал.1).

Такім чынам, у тэрытарыяльнай структуры прамысловасці Беларусі вядучую ролю адыгрывае невялікая колькасць буйных цэнтраў. Такі яе малюнак можна растлумачыць тэрытарыяльнай дыферэнцыяцыяй усёй сукупнасці фактараў і ўмоў (прыродных, эканамічных, сацыяльных, гістарычных, палітычных), якія мелі месца ў мінулым і маюць месца цяпер у межах і за межамі тэрыторыі краіны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэндэнцыя да канцэнтрацыі эканамічнай дзейнасці ў існуючых урбанізаваных арэалах з’яўляецца агульнасусветнай. Палова аб’ёму сусветнай вытворчасці сканцэнтравана на 1,5% тэрыторыі Зямлі [1].




**Малюнак - Аб’ём прамысловай вытворчасці на душу насельніцтва ў адміністрацыйных раёнах Рэспублікі Беларусь у сярэднім за 2011-2013 гг., млн. руб. (у бягучых цэнах)**

У сучасных умовах сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця Беларусі палярызацыя паміж яе тэрытарыяльнымі часткамі будзе таксама нарастаць. Адна з галоўных яе прычын – дэпапуляцыя, якая з кожным годам ахоплівае ўсё большую колькасць адміністрацыйных раёнаў. Сёння існуе даволі шмат раёнаў, дзе колькасць насельніцтва складае менш 20 тыс. чалавек: Акцябрскі, Бешанковіцкі, Бераставіцкі, Брагінскі, Бялыніцкі, Веткаўскі, Глускі, Дрыбінскі, Дубровенскі, Ельскі, Зэльвенскі, Клічаўскі, Краснапольскі,

Круглянскі, Свіслацкі,Слаўгарадскі, Кармянскі, Лёзненскі, Лоеўскі, Нараўлянскі, Расонскі, Ушацкі, Хоцімскі, Чавускі, Чачэрскі, Чэрыкаўскі, Шаркаўшчынскі і Шумілінскі. Калі ўлічыць, што ў кожным трэцім раёне краіны ўдзельная вага насельніцтва ва ўзросце старэй за працаздольны перавысіла ўжо 30%, малаверагодна спадзявацца на іх новае індустрыяльнае развіццё з такім людскім патэнцыялам. У гэтых умовах вырашальнае значэнне для эканамічнага развіцця Беларусі будзе належыць узаемадзеянню паміж буйнымі гарадамі і прыгараднымі тэрыторыямі, у т.л. сельскімі. Толькі такі падыход, на нашу думку, можа выратаваць ад далейшага заняпаду рэгіёны, якія валодаюць слабым дэмаграфічным патэнцыялам і прывесці да пэўнай дэканцэнтрацыі вытворчасці. Да таго ж паспрыяць гэтаму павінна добра развітая транспартная сетка дарог і найперш аўтамабільных.

Першыя крокі ў гэтым накірунку ўжо зроблены. Як станоўчую тэндэнцыю трэба адзначыць *стварэнне прамысловых аб'ектаў у сельскай мясцовасці,* якую можна таксама разглядаць як геаграфічную асаблівасць індустрыяльнага развіцця краіны ў сучасных умовах. У цяперашні час можна налічыць ужо не адзін іх дзесятак, геаграфія якіх ахоплівае ўсё рэгіёны Беларусі (табл.4).

Табліца 4 – Найважнейшыя прамысловыя аб'екты, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці Беларусі

| Брэсцкая вобласць | Віцебская вобласць | Гомельская вобласць | Гродзенская вобласць | Мінская вобласць | Магілёўская вобласць |
|---|---|---|---|---|---|
| Адоб-Агра, Пружанскі р-н в.Аранчыцы | Вітгран-М, Віцебскі р-н в.Сакольнікі | Бабушкіна, Жлобінскі р-н в.Салонае | Завод гарачай ацынкоўкі металавыра-баў, Лідскі р-н в.Даліна | Аўтамабіль-ныя канструк-цыі, Смаля-віцкі р-н в.Дзінараўка | Баір Вест, Магілёўскі р-н в.Красніца |
| ПРОФІЛІ ВОКС, Брэсцкі р-н в.Тэльмы | ПромТэх-Шпон, Віцебскі р-н в.Васількі | ГОСНІП, Мазырскі р-н в.Бібікі | Лакафарбавы завод, Дзяржынскі р-н в.Журавінка | Шатэ-М плюс, Мінскі р-н п.Прывольны | Газасілікат, Магілёўскі р-н в.Зацішша |
| Пінскдрэў- | | Знешгомель- | Жэнці, | Юнісон, | Політэкс, |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Андрыяна-Плюс, Пінскі р-н в.Пінкавічы | | буд, Гомельскі р-н п.Чонкі | Гродзенскі р-н в.Навумавічы | Мінскі р-н в.Абчак | Магілёўскі р-н в.Навасёлкі |
| | | | Едэм, Гродзенскі р-н в.Новая Гожа | Нясвіжскі завод медпрэ-паратаў, Нясвіжскі р-н в.Альба | Партнёр, Магілёўскі р-н в.Вейна |
| | | | Кандзі і К, Гродзенскі р-н в.Новая Гожа | Аквадзіў, Маладзечанскі р-н в.Малінаў-шчына | Элефант, Клічаўскі р-н в.Бацэвічы |
| | | | Торфабрыкет-ны завод “Дзітва”, Лідскі р-н в.Дзітва | Хладагент, Мінскі р-н в.Баравая | Дзіксі Мэн, Магілёўскі р-н в.Любуж |
| | | | | Проф-НІКІС, Барысаўскі р-н в.Углы | Скайфорест, Горацкі р-н в. |
| | | | | Петрапак, Мін-скі р-н аг. Сен-ніца | |
| | | | | Алкід, Мінскі р-н в.Каралёў Стан | |
| | | | | Забудова, Маладзечанскі р-н п.Чысць | |
| | | | | Август-Бел, Пухавіцкі р-н п. Дружны | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Галоўная прычына, якая штурхае прадпрымальнікаў да размяшчэння аб’ектаў па-за межамі гарадоў, – змяншэнне выдаткаў на прадукцыю за кошт таннай працоўнай сілы і льготнага падаткаабкладання.

Разам з тым нельга не адзначыць, што новае індустрыяльнае будаўніцтва ў краіне за апошнія дзесяцігоддзі замарудзілася. За гады незалежнасці ўзнікла не больш палутара дзесятка прадпрыемстваў і вытворчасцей, сярод якіх найперш трэба нагадаць “БЕЛ-ДЖЫ” у Барысаве, “Дарыду” у Ждановічах,

“Марко” у Віцебску, “Чэвляр” у Мінску, “Белкельме” у Белаазёрску, “Лакафарба” у Дзяржынску, “Слодыч” у Мінску, “Івента” у Светлагорску, “БелФарм” у Лагойску і інш. Улічваючы тое, што імпартазамяшчэнне абвешчана найважнешым дзяржаўным прыярытэтам, такое становішча нельга прызнаць здавальняючым. Зразумела, што пытанне эфектыўнасці палітыкі імпартазамяшчэння не простае і зводзіць яго толькі да стварэння новых аб’ектаў было б памылковым. Аднак і пагадзіцца з тым, што на набыццё шматлікіх прамысловых тавараў, прадуктаў харчавання, вытворчасць якіх можа быць арганізавана ўнутры краіны, даводзіцца траціць валютныя сродкі, таксама нельга. Пэўным выйсцем з дадзенай сітуацыі з’яўляецца развіццё прыватнай ініцыятывы па прыкладу Гродзенскай вобласці, дзе сфарміравана 31 індустрыяльная пляцоўка з адпаведнай інжынернай і транспартнай інфраструктурай для стварэння вытворчых аб’ектаў (у кожным горадзе раённага падпарадкавання). У бягучым годзе у вобласці плануецца адкрыць у кожным раёне новыя вытворчасці з колькасцю працуючых ад 15 чалавек з разлікам адно прадпрыемства на 10 тыс. насельніцтва [4]. Такія практычныя крокі з боку мясцовых органаў улады павінны паспрыяюць не толькі змягчэнню праблемы імпартазамяшчэння, але і, што не менш важна, дэканцэнтрацыі вытворчасці, а значыць, і змяншэнню палярызацыі паміж рэгіёнамі.

Яшчэ адна геаграфічная асаблівасць развіцця прамысловасці апошніх гадоў – *змяненне месца асобных абласных і рэгіянальных цэнтраў у агульным аб’ёме вырабляемай прадукцыі.* Так, калі напрыканцы XX ст. такія рэгіянальныя цэнтры, як Наваполацк і Мазыр па аб’ёму вытворчасці не ўваходзілі нават у першую дзесятку, дык у пачатку XXI ст. яны апынуліся ўжо не толькі ў першай тройцы, але і апярэдзілі свае абласныя цэнтры. Галоўная прычына такіх кардынальных змен месца гэтых гарадоў – хуткі рост вартасці прадукцыі Мазырскага і Наваполацкага НПЗ, якая прызначана пераважна для экспарту. Рэйтынг 20-ці найбуйнейшых прамысловых цэнтраў у 1990 – 2013 гг. выглядаў наступным чынам (табл.3):

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Табліца 3 – Рэйтынг 20-ці найбуйнейшых прамысловых цэнтраў Беларусі па агульным аб’ёме прамысловай вытворчасці ў 1990- 2013 гг., млрд руб.

| Месца | 1990 г. | 2000 г. | 2013 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | Мінск | Мінск | Мінск |
| 2 | Гомель | Наваполацк | Наваполацк |
| 3 | Магілёў | Мазыр | Мазыр |
| 4 | Віцебск | Магілёў | Гомель |
| 5 | Гродна | Гомель | Гродна |
| 6 | Брэст | Гродна | Магілёў |
| 7 | Бабруйск | Салігорск | Брэст |
| 8 | Баранавічы | Віцебск | Салігорск |
| 9 | Барысаў | Жлобін | Бабруйск |
| 10 | Орша | Бабруйск | Жлобін |
| 11 | Салігорск | Брэст | Віцебск |
| 12 | Наваполацк | Барысаў | Барысаў |
| 13 | Пінск | Баранавічы | Жодзіна |
| 14 | Ліда | Пінск | Слуцк |
| 15 | Маладзечна | Орша | Баранавічы |
| 16 | Мазыр | Ліда | Ліда |
| 17 | Жлобін | Маладзечна | Маладзечна |
| 18 | Жодзіна | Слуцк | Орша |
| 19 | Светлагорск | Жодзіна | Пінск |
| 20 | Слуцк | Светлагорск | Светлагорск |

Што тычыцца іншых прамысловых цэнтраў, іх “рух” у рэйтынгу найперш звязаны з запатрабаванасцю ці незапатрабаванасцю прадукцыі як на айчынным, так і замежным рынках.

Пэўную цікавасць выклікае выяўленне геаграфічных асаблівасцей развіцця прамысловасці краіны з пункту гледжання асобных яе відаў. Улічваючы тое, што на абласным узроўні адбываецца ніveліраванне тэрытарыяльных адрозненняў, паспрабуем выявіць гэтыя асаблівасці на раённым узроўні. У адпаведнасці з Агульнадзяржаўным класіфікатарам відаў эканамічнай дзейнасці прамысловасць падзяляецца на: 1) горназдабыўную, 2) апрацоўчую і 3) вытворчасць і размеркаванне электраэнергіі, газу і вады.

Беларусь, як вядома, – краіна апрацоўчай прамысловасці (на яе прыпадае звыш 90% усёй прадукцыі). За выключэннем Краснапольскага і Дрыбінскага раёнаў, ва ўсіх астатніх яна з’яўляецца асноўным відам

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

эканамічнай дзейнасці (самыя высокія паказчыкі ў Жлобінскім, Мазырскім і Аршанскім раёнах – адпаведна 99%, 98,5% і 98,5%).

Асобныя віды апрацоўчай прамысловасці займаюць вельмі рознае месца ў яе структуры. Так, удзельная вага вытворчасці харчовых прадуктаў, разам з напіткамі і табаком, вагаецца па раёнах (без гарадоў абласнога падпарадкавання) ад 2% у Мазырскім да 95% у Аршанскім, тэкстыльнай і швейнай вытворчасці – ад 0,01% у Гомельскім да 39% у Кармянскім, апрацоўка драўніны і вытворчасць вырабаў з яе – ад 0,2% у Мазырскім да 39% у Круглянскім і Расонскім, вытворчасць машын і абсталявання – ад 0,01% у Лёзненскім да 36% у Талачынскім раёнах. Пры гэтым у Краснапольскім і Шумілінскім раёнах апошняй вытворчасці зусім няма. Іншыя віды апрацоўчай прамысловасці больш лакалізаваныя, г.зн. іх геаграфія таксама не ахоплівае ўсіх раёнаў.

Вытворчасць і размеркаванне электраэнергіі, газу і вады займае другое месца ў структуры прамысловасці краіны (на яе прыпадае каля 8% прадукцыі). Максімальныя значэнні характэрны для Краснапольскага (54%), Дрыбінскага (50%) і Брагінскага (42%) раёнаў.

На долю горназдабыўной прамысловасці прыпадае толькі 1,5% прамысловай прадукцыі. Ёсць шэраг раёнаў, у якіх зусім не зарэгістравана прадпрыемстваў гэтага віду дзейнасці (Ганцавіцкі, Пінскі, Аршанскі, Веткаўскі, Буда-Кашалёўскі, Гомельскі, Чэрвеньскі, Кіраўскі і Шклоўскі), а ў такіх раёнах, як Лунінецкі, Лельчыцкі і Жыткавіцкі яе доля з'яўляецца максімальнай – адпаведна 46%, 23% і 10%. Вось такая *высокая дыферэнцыяцыя паміж раёнамі ў месцы асобных відаў прамысловай дзейнасці ў структуры ўсёй прамысловай вытворчасці* з'яўляецца галоўнай геаграфічнай асаблівасцю яе развіцця ў сучасных умовах. Такая стракатасць мае свае прычыны і тлумачэнне. Немагчыма развіваць усе віды эканамічнай дзейнасці паўсюдна і ў роўнай ступені – гэта аксіёма. Імкненне сканцэнтраваць вытворчасць у абмежаванай колькасці цэнтраў, пры ўмове

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

наяўнасці неабходных для гэтага чыннікаў, – адзін з накірункаў павышэння яе эфектыўнасці. Зыходзячы з таго, што адміністрацыйныя раёны краіны валодаюць розным патэнцыялам для вытворчага развіцця, такая дыферэнцыяцыя для шэрагу відаў апрацоўчай прамысловасці цалкам апраўдана (напрыклад, вытворчасць транспартных сродкаў і абсталявання, хімічная вытворчасць і інш.). Аднак нельга пагадзіцца з тым, што шматлікія віды прамысловай дзейнасці, геаграфія якіх павінна быць значна шырэйшай, адсутнічаюць у вялікай колькасці раёнаў увогуле ці маюць зусім малую ўдзельную вагу ў агульнай прамысловай вытворчасці (напрыклад, вытворчасць харчовых прадуктаў, неметалічных мінеральных прадуктаў і інш.).

Ці ёсць падставы да змен у гэтай частцы ў бліжэйшыя гады? На нашу думку, пэўныя змены павінны адбыцца і звязана гэта з тым, што ўласныя сыравінныя рэсурсы рэгіёнаў выкарыстоўваюцца пакуль недастаткова шырока, а набыццё іх на знешнім рынку абыходзіцца вельмі дорага. Таму можна меркаваць аб некаторым павелічэнні ўдзельнай вагі горназдабыўной прамысловасці ў агульным яе аб’ёме. Актыўнае выкарыстанне мясцовых і ўзнаўляльных энергакрыніц павінна прывесці не толькі да змянення структуры прамысловай вытворчасці, але і да геаграфічнай дэканцэнтрацыі. Менавіта на гэта накіраваны Канцэптуальныя палажэнні рэгіянальнага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2015 года, Праграма развіцця прамысловага комплексу Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 года, Праграма асваення радовішчаў карысных выкапняў і развіцця мінеральна-сыравіннай базы Рэспублікі Беларусь на 2011-2015 гады і на перыяд да да 2020 года і інш.

## Літаратура


1. Доклад о мировом развитии. Новый взгляд на экономическую географию. Всемирный банк. М., 2009


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Концептуальные положения регионального развития Республики Беларусь до 2015 года / под науч. ред. П.Г. Никитенко. Минск, 2009.
3. Праграма развіцця прамысловага комплексу Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 года. Мінск, 2012.
4. Экономика Беларуси. Минск, 2014, №1.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ